Наш Магілёў

Грамадска-палітычная незалежная газета горада
№ 54(16), снежань 2010 года

Тэма нумару: Выбары. Пасляслоўе

Один день, который вошёл в историю

Андрей Волков

19 декабря на пл. Независимости в Минске неизвестные спровоцировали силовое подавление акции протеста. Фотографии провокаторов уже облетели весь мир, мы также публикуем их. Больше фото желающие могут найти в сети интернет.

Тем не менее, эти люди продолжают находится на свободе, а вместо них в тюрьмы кинули более 600 человек, из которых пятеро - кандидаты в Президенты Республики Беларусь.

19 человек находятся под арестом по Уголовному обвинению, им грозит до 15 лет лишения свободы.

Акция протеста против фальсификации выборов должна была пройти мирно. Об этом неоднократно в своих выступлениях на телевидении заявляли кандидаты в Президенты. Это нормальная, мировая практика, когда кандидаты вместе с избирателями встречают свою победу вместе на площади или протестуют против результатов выборов.

Тем не менее, ещё за несколько часов до начала акции протеста бойцами спецподразделений был жестоко избит кандидат в Президенты Владимир Некляев. Впоследствии, Некляева выкрали из больницы неизвестные.

На Октябрьской площади в Минске собралось, по разным оценкам, от 50 до 75 тысяч человек. Среди них были основные кандидаты в Президенты: Санников, Романчук, Статкевич, Костусев.

Как заявили потом участники событий, ни у кого из присутствующих лидеров не было чёткого плана действий, ожидалось, что план был у Некляева.

Мирное собрание перекрыло проспект Независимости и люди колонной перешли на пл. Независимости, к зданию Правительства, в котором располагалась Центральная Избирательная комиссия во главе с Ермошиной.

Отсутствие чёткого плана и провокации неизвестных привели к силовому разгону присутствующих.

Этой же ночью начались массовые аресты лидеров оппозиции и демократических активистов.

Европейский Союз и США однозначно осудили силовой разгон мирного собрания и не признали результаты выборов. Выборы признали пока страны с сомнительными режимами: Венесуэла, Грузия и т.п. До сих пор нет оценки выборов со стороны России.



На фото - провокатор, который бил стёкла в Доме правительства, держит связь через спрятанный в рукаве микрофон



Провокатора камеры снимают сзади







Неизвестный несёт на место погрома ломики и лопаты

РЭДАКЦЫЙНАЯ ПОШТА



Сутыкнуліся з праблемай і не ведаеце да каго звярнуцца? Пішыце нам - мы паспрабуем дапамагчы Вам!

Магілёў, вул. Ленінская, 29, оф. 315,
e-mail: nash_mogilev@tut.by

Масавыя парушэнні і фальсіфікацыя выбараў

Вітольд Няўрыда

Фарміраванне выбарчых камісій

На Магілёўшчыне ў склад абласной выбарчай камісіі былі вылучаны тры прадстаўнікі дэмакратычных сілаў. Па выніках сумеснага пасяджэнне кіраўніцтва Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта і Прэзідыума Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў у склад абласной выбарчай камісіі быў уключаны прадстаўнік ад Аб'яднанай Грамадзянскай партыі Уладзімір Парфёнаў, астатнім вылучэнцам - праваабронцам Барысу Бухелю і Сяргею Фаміну было адмоўлена. У склад раённых выбарчых камісій было вылучана 19 дэмакратаў, але ніхто з іх туды не патрапіў.

На Магілёўшчыне было створана 818 участковых выбарчых камісій, у тым ліку ў Магілёве - 153, у Бабруйску - 109. Дэмакраты Магілёўшчыны вылучылі ў склад гэтых камісій ад палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў 121 чалавека. Сярод арганізацый, якія вылучалі сваіх прадстаўнікоў былі ГА БНФ "Адраджэнне", Беларуская партыя левых "Справядлівы свет", Аб'яднаная Грамадзянская партыя і ГА "Грамадзянскі Форум". У склад гэтых камісій не здолеў патрапіць ні адзін прадстаўнік ад дэмакратаў. Абскарджванне ў судах неўключэння ў склад камісій прадстаўнікоў апазіцыі не дало ніякіх вынікаў.

Праваабронцы адзначаюць, што ў 20 з 26 раённых выбарчых камісій іх старшынямі з'яўляліся супрацоўнікі выканкамаў, а ў кіраўніцтве двух трацін камісій (17-ць з 26-ці) яны мелі большасць. Гэтаксама на сябе звяртае ўвагу той факт, што ў некаторых райвыбкамісіях члены гэтых камісій заставаліся нязменнымі членамі на працягу 10-15 гадоў.

Праваабаронцы таксама падкрэсліваюць факт таго, што амаль усе ўчастковыя выбарчыя камісіі не былі максімальна ўкамплектаваны і можна было без праблем уключаць у іх склад прадстаўнікоў апазіцыі.

Таксама трэба адзначыць, што праваабаронцам упершыню ў гісторыі давялося патрапіць на сумесныя пасяджэнні кіраўніцтва Магілёўскага гарвыканкама і Прэзідыума гарадскога Савета дэпутатаў, а таксама кіраўніцтва Магілёўскага аблвыканкама і Прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў па фарміраванні выбарчых камісій.

Збор Подпісаў

Збор подпісаў, як адзначылі магілёўскія праваабронцы, праходзіў без перашкод з боку дзеючай улады. У Магілёве быў вызначаны пералік месцаў дзе забаранялася яго праводзіць - ва ўсіх астатніх месцах дазвалялася выстаўляць пікеты з мэтай збору подпісаў за таго, ці іншага кандыдата.

Першапачаткова, было забаронена пікетаванне на аб'ектах чыгуначнага транспарту. Акрамя гэтага не дазвалялася пікетаванне на адлегласці менш чым 50 метраў ад будынкаў прадстаўнічых, выканаўчых і распарадчых органаў, судоў і органаў пракуратуры, тэрытрыях арганізацый, якія забяспечваюць абараназдольнасць, бяспеку дзяржавы і жыццядзейнасць насельніцтва. У гэты спіс патрапілі: грамадскі транспарт, прадпрыемствы вода,- цепла- і энэргазабеспячэння, бальніцы, паліклінікі, дзіцячыя дашкольныя ўстановы і агульнаадукацыйныя ўстановы, а таксама плошча Леніна і падземныя пераходы горада. Пазней, гарвыканкам дазволіў збор подпісаў на плошчы Леніна і падземках горада.

Трэба адзначыць, што праваабронцам сталі вядомы факты, калі ўлада выкарыстоўвала адміністрацыйны рэсурс падчас збору подпісаў за кандыдата ў Прэзідэнты Аляксандра Лукашэнка. Подпісы ў яго падтрымку збіраліся на розных дзяржаўных прадпрыемствах горада, а таксама ва ўніверсітэтах у працоўны і вучэбны час.

Па выніках збору подпісаў не ўсе раённыя выбарчыя камісіі давалі звесткі аб колькасці сабраных подпісаў у падтрымку таго ці іншага кандыдата ў Прэзідэнты.

Паводле інфармацыі атрыманай праваабаронцамі ад членаў Кастрычніцкай і Ленінскай раённых выбарчых камісій г.Магілёва больш усяго подпісаў было сабрана за прэтэндэнта на пасаду Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнка - 30 582 подпісы. За ім ідзе Аляксей Міхалевіч з 24 196 подпісамі, Уладзімір Някляеў з 16 598 подпісамі, Рыгор Кастусёў з 16 545 подпісамі і замыкае пяцёрку лідэраў Яраслаў Раманчук, за якога сабралі 12 835 подпісаў. Члены ініцыятыўных груп прэтэндэнтаў на пасаду Прэзідэнта сабралі за Міколу Статкевіча 12 381 подпісы, Андрэя Саннікава - 8 981, Дзмітрыя Уса - 9 044, Віктара Цярэшчанку - 7 123, Віталя Рымашэўскага - 6 047, і за Юрыя Глушакова усяго 57 подпісаў.

Агітацыя

Магілёўскія газеты "Веснік Магілёва", "Магілёўская праўда", "Днепровская неделя" і "Магілёўскія ведамасці" у сваіх публікацыях амаль не ўзгадвалі апанентаў дзеючаму Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Лукашэнку. Тое самае датычылася і аналізу кантэнту дзяржаўных сайтаў, на якіх узгадваўся толькі дзеючы Прэзідэнт. Толькі набліжаючыся непасрэдна да дня выбараў некаторыя з газетаў пачалі ўзгадваць прозвішчы кандыдатаў на прэзідэнцкае крэсла, а некаторыя з іх даваць план высупу кандыдатаў па дзяржаўнаму тэлебачанню і радыё.

Магілёўскія праваабронцы адзначалі, што дэмакратычныя кандыдаты ў Прэзідэнты не мелі магчымасці на роўных весці агітацыю.

Па-першае гэта звязана з тым, што вывешаныя імі плакаты і лістоўкі на інфармацыйных стэндах зрываліся кожны дзень. Падругое, не ўсе дзяржаўныя арганізацыі, установы і прадпрыемствы пагаджаліся размяшчаць на сваіх інфармацыйных стэндах інфармацыю аб дэмакратычных кандыдатах. Адмову гэта рабіць яны каментавалі тым, што яны ўжо вызначыліся з выбарам і іншым кандыдатам на іх стэндах не месца. Па-трэцяе, было абмежавана колькасць месцаў для вядзення агітацыі. Што датычыцца Магілёва, то ў Кастрычніцкім раёне горада першапачаткова існавала ўсяго 2 месца для вядзення агітацыі, у Ленінскім - 3. Прычым некаторыя пляцоўкі для правядзення масавых мерапрыемстваў знаходзіліся ў аварыйным стане (2 з 5). Пазней колькасць месцаў для правядзення масавых мерапрыемстваў рашэннямі адміністрацый раёнаў было павялічына. Тым не менш іх аказалася недастаткова. Сярод вызначыных месцаў толькі 3-4 былі адносна людныя - усе астатнія размяшчаліся на перыферыі горада. Праваабронцы адзначаюць, што пры вызначэнні месцаў для агітацыі чыноўнікі скарысталіся прынцыпам - дазволена толькі тое, што вызначына, у той жа самы час пры зборы подпісаў дзейнічаў іншы прынцып - дазволена ўсё, што не забаронена. Па-чацвёртае, яшчэ ні аднаму дэмакратычнаму кандыдату, альбо яго даверанай асобе не дазволілі сустрэцца з працоўным калектывам таго, ці іншага дзяржаўнага прадпрыемства, установы ці арганізацыі горада.

Сустрэчы з давераньмі асобамі Лукашэнкі праходзілі на розных прадпрыемствах і арганізацыях горада, патрапіць на якія прадстаўнікі дэмакратычных поглядаў так і не здолелі. Акрамя гэта старшыня аблвыканкама Пётр Руднік хаваў свае сустрэчы ад дэмакратаў, каб тыя не задавалі яму правакацыйных пытанняў.

Выбары

У Магілёўскай вобласці было зарэгістравана 3999 назіральнікаў. Больш усяго назіральнікаў выдвінулі грамадскія аб'яднанні - 2494. Сярод іх 594 ад грамадскага аб'яднання ветэранаў, 556 ад Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, 555 - ад БРСМ і 426 ад "Белай Русі". Грамадзяне шляхам подачы заяваў выдвінулі 1032 назіральнікі, працоўныя калектывы - 370. Акрамя гэтага, у вобласці працавала шэсць міжнародных назіральнікаў ад БДІПЧ АБСЕ.

Выбары азнаменаваліся тым, што на датэрміновае галасаванне людзей выганялі цэлымі інтэрнатамі, універсітэтамі і працоўнымі калектывамі. Жыльцоў адной з выпраўленчых установаў адкрытага тыпу пад канвоем прывозілі на ўчастак - выдавалі ім пашпарты для атрымання бюлетэняў і збіралі іх пасля таго, як "хімікі" выканалі свой грамадзянскі абавязак. Людзі ішлі на галасаванне пад пагрозамі - часам ім пагражалі пазбаўленнем месца ў інтэрнаце, растаржэннем працоўнага кантракту, альбо адлічэннем з універсітэта за пропускі, альбо акадэмічную непаспяваемасць.

Выбарчыя вурны ў Магілёве былі выключна драўлянымі і мелі шчыліны, у якія маглі без праблем пралезці бюлетэні. Акрамя гэтага днішчы вурн, якія канструктыўна былі выкананы такім чынам, што можна было без праблем адкрыць іх пры дапамозе стамескі ці адкруткі не зрываючы пячатку, дадаткова не апячатваліся.

Большасць назіральнікаў адзначае, што члены выбарчых камісій не давалі звестак аб ходзе галасавання - колькасці прагаласаваўшых датэрмінова кожны дзень, агульнай колькасці прагаласаваўшых датэрмінова, прагаласаваўшых на даму, а таксама ў дзень выбараў.

Па надуманных прычынах былі выдалены з выбачых участкаў некалькі назіральнікаў. Некаторыя атрымалі афіцыйныя папярэджванні за сваю любазнацельнасць і жаданне назіраць за рэальным падлікам галасоў.

У дзень галасавання назіральнікаў не падпускалі да сталоў, дзе адбываўся падлік бюлетэняў. Назіральнікі таксама не маглі бачыць таго, за каго ў кожным з бюлетэняў быў пастаўлены галак.

На некаторых участках для галасавання (№51, 52) выніковыя пратаколы аб выніках галасавання не вывешваліся. Старшыні камісій спасыляліся на неабходнасць праверкі сапраўднасці звестак у аблвыканкаме, пасля чаго запэўнівалі, што вывесяць іх.

Адзін з членаў участковай камісіі, якая размешчана на адным з выбарчых участкаў сярэдняй школы №42, паведаміў праваабронцам, што на яго ўчастку адбывалася ўкідванне бюлетэняў. Працэс адбываўся наступным чынам - адзін член камісіі трымаў паперку, якой неабходна было заклеіць вурну для галасавання, а другі ў гэты момант укідваў бюлетэні. Паралельна з гэтым яшчэ некалькі членаў камісіі ў гэты ж самы час размаўлялі з назіральнікамі, адцягваючы іх увагу ад вурны для галасавання.

НОВЫЕ ДАННЫЕ НЕЗАВИСИМЫХ ЭКЗИТ-ПОЛЛОВ: ЛУКАШЕНКО НЕ ПОБЕЖДАЕТ В ПЕРВОМ ТУРЕ

bsdp.org

Один из сотрудников компании TNS (компания официально зарегистрирована белорусским Центризбиркомом для проведения экзит-полов 19 декабря), пожелавший остаться неизвестным, передал реальные данные проводимого компанией TNS экзитпола по состоянию на 18.00. Данные выглядят следующим образом:

В лидерах по-прежнему Александр Лукашенко - за него отдали свои голоса 42,2% опрошенных на выходах из участка избирателей. Ближайшая тройка преследователей выглядит следующим образом: Владимир Некляев - 17,7%, Андрей Санников - 13,2%, Николай Статкевич - 8,9%. Данные по остальным кандидатам в президенты:, Григорий Костусев - 5,0%, Ярослав Романчук - 4,2%, Виталий Рымашевский - 3,3%, Алесь Михалевич - 1,6%, Виктор Терещенко - 0,8%, Дмитрий Усс - 0,4%. Против всех - 2,7%.

По данным экзит-пола, параллельно проведенного Международным центром социологических исследований "SOCIUM" (социопрос проводился фактически нелегально, под жёстким прессингом властей) Александр Лукашенко получил 40,2% голосов опрошенных, идущий вторым Владимир Некляев - 19,8%, идущий третьим Андрей Санников - 11,5%. Голоса, отданные за остальных кандидатов, распределились следующим образом: Николай Статкевич - 7,2%, Ярослав Романчук - 5,8%, Григорий Костусев - 5,2%, Виталий Рымашевский - 4,4%, Алесь Михалевич - 1,7%, Виктор Терещенко - 1,1%, Дмитрий Усс - 0,7%. Против всех - 2,4%.

Данные экзит-полов, конечно, не могут считаться истиной в последней инстанции. Тем не менее, эти цифры достаточно убедительно показывают, что Александр Лукашенко лидирует среди всех кандидатов в президенты, но не набирает положенных для победы в первом туре 51% голосов избирателей.

Кроме того, как сообщил представитель "SOCIUM", данные второго опроса могут иметь некоторые погрешности из-за того, что не на всех участках, где проводился экзит-полл, власти его дали провести до конца.

Напомним, по данным на 15:00, согласно опросу TNS, Александр Лукашенко получил 40,5% голосов, Владимир Некляев - 19,3%, Андрей Санников - 14,0%, Николай Статкевич - 8,6%, Григорий Костусев - 4,6%, Ярослав Романчук - 4%, Виталий Рымашевский - 2,9%, Алесь Михалевич - 1,8%, Виктор Терещенко - 1,2%, Дмитрий Усс - 0,9%. Против всех - 2,2%.

Опрос SOCIUM дал на вышеозначенное время следующие показатели: Александр Лукашенко получил 38,4% голосов опрошенных, идущий вторым Владимир Некляев - 18,7%, идущий третьим Андрей Санников - 12,2%. Голоса, отданные за остальных кандидатов, распределились следующим образом: Николай Статкевич - 7,8%, Ярослав Романчук - 5,4%, Григорий Костусев - 4,8%, Виталий Рымашевский - 4,1%, Алесь Михалевич - 2,4%, Виктор Терещенко - 1,7%, Дмитрий Усс - 1,1%. Против всех - 3,4%.

Верховный комиссар ООН по правам человека призвала немедленно освободить арестованных кандидатов и их сторонников

БелаПАН

Верховный комиссар ООН по правам человека Нави Пиллэй призвала белорусские власти "немедленно освободить оппозиционных кандидатов в президенты и их сторонников, которые не участвовали в насилии и не призывали к нему".

В заявлении комиссара, распространенном 21 декабря, выражается "серьезная озабоченность в связи с использованием силы в отношении мирных участников демонстрации, насилием и похищением оппозиционных кандидатов и их сторонников, задержаниями активистов оппозиции и правозащитников, а также обысками и давлением на независимые неправительственные организации".

Пиллэй осудила действия "радикально настроенной части оппозиции", при этом отметив, что "ответственные структуры власти должны уважать и гарантировать своим политическим оппонентам право на мирную демонстрацию и свободу слова".

Верховный комиссар ООН по правам человека обратилась к белорусским властям с требованием обеспечить безопасность правозащитников, журналистов и представителей гражданского общества, а также призвала стороны "воздержаться от насилия и соблюдать права человека".

Ранее с осуждением насилия в отношении оппозиции и массовых арестов выступили США, Германия, Австрия, Франция, Чехия, Словакия, Литва, руководство ЕС, другие страны и структуры.

Бабруйскія вайскоўцы выпадкова збілі 79 перапранутых у цывільнае калег

"Русская служба новостей"

Міліцэйскі спецназ падчас акцыі апазіцыі ў Мінску 19 снежня выпадкова збіў 79 перапранутых у цывільнае супрацоўнікаў МУС, паведамляе "Руская служба навінаў" са спасылкай на ўнутранае расследаванне ведамства.

Па словах крыніцы, у ведамстве, у МУС спрабуюць высвятліць, чаму байцы Унутраных войскаў, дастаўленыя на разгон мітынгу з Бабруйска, не былі папярэджаны, што сярод пратэстоўцаў знаходзяцца іх мінскія калегі, перапранутыя ў цывільнае.

На думку РСН, менавіта ў выніку гэтага 79 супрацоўнікаў МУС атрымалі розныя траўмы.

19 затрыманых па справе 19 снежня арыштаваныя.

Радыё Свабода

Сьледзтва абрала меру стрыманьня ў выглядзе ўтрыманьня пад вартай у дачыненьні да 19 падазраваных па справе аб масавых беспарадках у Менску 19 сьнежня.

ГУУС Менска паведамляе:

"Сьледчым упраўленьнем папярэдняга расьсьледаваньня ГУУС Мінгарвыканкама арыштаваныя 19 асобаў, падазраваных у датычнасьці да зьдзяйсьненьня злачынства, прадугледжанага артыкулам 293 КК РБ (Масавыя беспарадкі). Усе падазраваныя ўтрымліваюцца пад вартай у сьледчым ізалятары КДБ Рэспублікі Беларусь. Праводзяцца сьледчыя дзеяньні".

ГУУС таксама прыводзіць сьпіс арыштаваных:

1. Арастовіч Аляксандр Іванавіч, 1952 г.н.;
2. Бандарэнка Дзмітрый Яўгенавіч, 1963 г.н.;
3. Вазьняк Сяргей Вітальевіч, 1962 г.н.;
4. Дзьмітрыеў Андрэй Уладзіміравіч, 1981 г.н.;
5. Класкоўскі Аляксандр Аляксандравіч, 1978 г.н.;
6. Корбан Алег Міхайлавіч, 1985 г.н.;
7. Лябедзька Анатоль Уладзіміравіч, 1961 г.н.;
8. Міхалевіч Аляксей Анатольевіч, 1975 г.н.;
9. Някляеў Уладзімір Пракопавіч, 1946 г.н.;
10. Атрошчанкаў Аляксандр Сяргеевіч, 1981 г.н.;
11. Паўлаў Анатоль Васільевіч, 1949 г.н.;
12. Палажанка Анастасія Ўладзіміраўна, 1990 г.н.;
13. Радзіна Натальля Валянцінаўна, 1979 г.н.;
14. Рымашэўскі Віталь Анатольевіч, 1975 г.н.;
15. Саньнікаў Андрэй Алегавіч, 1954 г.н.;
16. Севярынец Павел Канстанцінавіч, 1976 г.н.;
17. Статкевіч Мікалай Віктаравіч, 1956 г.н.;
18. Фядута Аляксандр Іосіфавіч, 1964 г.н.;
19. Халіп Ірына Уладзіміраўна, 1967 г.н.

Костусев передал в ЦИК жалобу - одну за всех

Сергей КОРОЛЕВИЧ, "Салідарнасць"

В Центризбирком Беларуси поступила жалоба от кандидата в президенты Григория Костусева с требованием признать итоги президентских выборов недействительными. Жалобу в ЦИК передал вечером 22 декабря сам кандидат в президенты.

Как сообщил БелаПАН секретарь ЦИК Николай Лозовик, это единственная жалоба, в которой кто-либо из кандидатов в президенты просит признать нынешние выборы президента недействительными.

Согласно Избирательному кодексу, кандидаты в президенты могут обжаловать результаты выборов в ЦИК в течение трех дней после их окончания. То есть этот срок завершается сегодня, 22 декабря. Соответствующее заявление кандидат должен принести в ЦИК лично.

Кандидаты Владимир Некляев, Андрей Санников, Виталий Рымашевский, Николай Статкевич и Алексей Михалевич, задержанные во время акции 19 декабря, сейчас находятся в следственном изоляторе КГБ. В отношении организаторов несанкционированной акции возбуждено дело по статье 293 Уголовного кодекса (массовые беспорядки). Им грозит до 15 лет лишения свободы.

Как сообщил БелаПАН Григорий Костусев, он просит ЦИК считать свою жалобу также поданной от тех кандидатов в президенты, которые лишены возможности это сделать. Костусев уверен, что при наличии такой возможности они реализовали бы свое право обжаловать итоги выборов.

"Из-за незаконного ареста они лишены возможности самостоятельно подать такие же жалобы. Уверен, они бы воспользовались своим правом опротестовать итоги выборов", - сказал он.

Костусев сообщил, что обоснование жалобы размещается на 38 страницах. Кроме того, 363 страницы составляет приложение с жалобами наблюдателей демократических представителей участковых комиссий, которые они подавали в избирательные комиссии разного уровня и прокуратуру.

"В жалобе перечислены многочисленные факты грубейшего нарушения национального избирательного законодательства и использования невиданного административного ресурса и бюджетных средств при проведении выборов, что повлияло на их итоги в целом по стране", - сказал Костусев.

Помимо Центризбиркома кандидат в президенты может оспорить официальные результаты голосования в Верховном суде - это необходимо сделать в течение 10 дней после выборов.

Напомним, по данным ЦИК, за Александра Лукашенко проголосовало 79,67% избирателей. Андрей Санников получил 2,56% голосов, Ярослав Романчук - 1,97%, Григорий Костусев - 1,97%, Владимир Некляев - 1,77%, Алексей Михалевич - 1,2%, Виталий Рымашевский - 1,1%, Виктор Терещенко - 1,08%, Николай Статкевич - 1,04%, Дмитрий Усс - 0,48%.

Окажите солидарную помощь пострадавшим в мирной акции протеста!

Телефоны для связи: 8-029-744-24-58, 8-044-763-00-76



Адвокат: «Андрей Санников представляет из себя ужасное зрелище»

Татьяна Коровенкова, «БелаПАН»

Кандидат в президенты Беларуси Андрей Санников сильно избит и «представляет из себя ужасное зрелище». Об этом сообщил БелаПАН адвокат политика Павел Сапелко.

Адвокат встречался со своим подзащитным вечером 20 декабря. По словам Сапелко, Санников, избитый во время акции в Минске 19 декабря, «практически не может передвигаться».

– Нога у него или сильно ушиблена, или вывихнута. Ему там даже не поставили диагноза, хотя у меня сложилось впечатление, что она может быть и сломана. Кроме этого, его били по голове, поэтому отдаленные последствия чувствуются. Травмированы у него и руки — на них гематомы, — сказал адвокат.

Он сообщил, что во время допроса Санникову было заявлено ходатайство «о направлении на медицинское освидетельствование на предмет установления степени тяжести телесных повреждений».

– По результатам этого освидетельствования мы будем, наверняка, подавать жалобу в прокуратуру для того, чтобы привлечь к ответственности тех лиц, которые абсолютно немотивированно применили силу в отношении Санникова. По моим представлениям о законности, его должны были отправить на освидетельствование немедленно, — подчеркнул Сапелко.

Адвокат не смог сказать, когда в следующий раз сможет встретиться со своим подзащитным. «Дело в том, что сейчас очень много задержанных в КГБ, а изолятор комитета имеет ограниченные возможности по одновременному приему посетителей. Жду, когда будет следующее следственное действие с участием Андрея Олеговича, тогда я его увижу», — пояснил Сапелко.

– По устоявшейся практике правоохранительных органов, чтобы лишить меня возможности доносить до общественности состояние дел, с меня по доброй традиции взята подписка о неразглашении данных предварительного расследования, — сообщил адвокат.

– Но это не мешает мне заявить о том, что Андрей Олегович абсолютно невиновен и подозрения, выдвинутые в его отношении, абсолютно не имеют под собой оснований. Все случившееся во время массового мероприятия мы, сторона защиты, считаем явной провокацией, — подчеркнул Павел Сапелко.

22 декабря министр внутренних дел Анатолий Кулешов заявил журналистам, что задержанные кандидаты Андрей Санников и Владимир Некляев «абсолютно здоровы, абсолютно нормально, комфортно себя чувствуют»

81,7% апытаных мяркуюць, што хваляванні ў Мінску справакавалі ўлады

«Наша Ніва»

Такі вынікі інтэрнэт-апытання, праведзенага сайтам naviny.by. Толькі 7,4% апытаных вераць афіцыйнай версіі, што за беспарадкамі стаіць апазіцыя. Версію "замежныя спецслужбы" адстойваюць 2,1%. Усяго ў апытанні ўзялі ўдзел каля 3000 чалавек.



Что с Некляевым???

Вадим Ливнев, фото РИА «Новости»

Светлана Алексиевич, Рыгор Бородулин, Геннадий Буравкин, Нил Гилевич, Алесь Рязанов и другие известные белорусские писатели выступили с заявлением, в котором требуют безотлагательного освобождения кандидата в президенты Беларуси Владимира Некляева. Но пока к поэту не пускают даже адвоката.

23 декабря распространено заявление следующего содержания:

«Мы глыбока абураныя жорсткім збіццём і арыштам нашага калегі, выдатнага паэта, лідэра грамадскай кампаніі "Гавары праўду", кандыдата ў прэзідэнты Беларусі Уладзіміра Някляева.

Зараз гаворка ідзе пра захаванне ягонага жыцця. Уладзімір Някляеў павінен знаходзіцца не ў следчым ізалятары, а ў шпіталі пад пільным наглядам медыкаў.

Патрабуем тэрмінова забяспечыць Уладзіміру Някляеву неабходную медыцынскую дапамогу і неадкладна вызваліць яго».

Валянцін Акудовіч, Святлана Алексіевіч, Уладзімір Арлоў, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Лявон Вольскі, Анатоль Вярцінскі, Ніл Гілевіч, Сяргей Законнікаў, Віктар Казько, Алесь Пашкевіч, Барыс Пятровіч, Алесь Разанаў, Міхась Скобла, Андрэй Хадановіч.

Между тем, ситуация становится все более тревожной.

Накануне министр внутренних дел Анатолий Кулешов сказал журналистам, что задержанные кандидаты в президенты Андрей Санников и Владимир Некляев «абсолютно здоровы, абсолютно нормально, комфортно себя чувствуют». Степень циничности этого заявления стала окончательно ясна уже через пару часов, когда Павел Сапелко, адвокат Андрея Санникова, сообщил, что его подопечный «представляет из себя ужасное зрелище». Политик практически не может передвигаться.

Судя по всему, состояние Владимира Некляева еще хуже. Именно поэтому к нему уже второй день адвоката не пускают вообще под смехотворным предлогом, что в КГБ нет свободных кабинетов, где кандидат в президенты мог бы встретиться со своим защитником.

С каждым часом опасения за жизнь Владимира Некляева возрастают. 22 декабря в Интернете начали распространяться слухи, что лидер кампании «Говори правду» скончался в СИЗО. Развеять их власть могла в один момент, организовав встречу кандидата в президенты с адвокатом или супругой. Но по каким-то причинам она этого не делает.

Нам остается только надеяться на лучшее...

Ананімны сьведка падзеяў паведамляе, што падчас штурму і разгону плошчы Незалежнасьці спэцназаўцамі ў мэтро загінулі людзі, колькасьцю да 10 чалавек.

Як гэта было? Паводле словаў ананімнага сьведкі, на станцыі мэтро Плошча Леніна было шмат людзей, якія прыехалі туды, каб трапіць на плошчу Незалежнасьці і прыняць удзел у народным пратэсце. Каля выйсьця зь мэтро, іх чакалі спэцназаўцы і іншыя прадстаўнікі сілавых структур зь шчытамі і дубінкамі. Спэцназаўцы пачалі піхаць і ціснуць людзей назад у мэтро. Людзі пачалі падаць уніз і таптаць адзін аднаго, пачалася паніка. Людзі тапталі адзін аднаго, так як гэта было на Нямізе ў "Дзень Піва". Людзей было так шмат, што яны пачалі піхаць адзін аднаго. Людзі якія стаялі каля рэяк, пачалі падаць на рэйкі.

Сьведка паведамляе, што некаторыя загінулі ад току, а некаторых (пераехаў цягнік – інфармацыя ўдакладняецца). Пасля раздаліся выстралы. Сьведка зазначае, што былі застрэляны як мінімум 4 чалавекі.

Наш Магілёў

Незалежнае грамадска - палітычнае выданне Горада
Выдавец Андрусь Волкаў, дырэктар Вітольд Няўрыда.
Надрукавана на ксераксе ў горадзе Магілёве. Наклад: 299 ас.
e-mail: nash_mogilev@tut.by